УДК 378.1

# СУЧАСНЫЯ ФОРМЫ АНЛАЙН-АДУКАЦЫІ: ПЛЮСЫ І МІНУСЫ

**Босак А.А.**, к.ф.н., дацэнт
*Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт,*
*Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Анатацыя: У артыкуле разглядаюцца сучасныя формы анлайн-адукацыі, такія як відэаканферэнцыі, аўдыёканферэнцыі, кампутарныя канферэнцыі, відэалекцыі, вэб-заняткі. Прыводзяцца перавагі і недахопы кожнай з форм дыстанцыйнага навучання, ацэньваецца роля дыстанцыйных тэхналогій у павышэнні эфектыўнасці адукацыі.

Ключавыя словы: дыстанцыйнае навучанне, відэаканферэнцыі, аўдыёканферэнцыі, кампутарныя тэлеканферэнцыі, вэб-заняткі, відэалекцыі.

# MODERN FORMS OF ONLINE-EDUCATION: ADVANTAGES AND DIS ADVANTAGES

**Bosak A.A., assistant professor**
*Belarus State Economic University*
*Minsk, Belarus*

Summary: this article examines modern forms of online education such as video conferences, audio conferences, computer conferences, video lectures, chat and web sessions. The advantages and disadvantages of each form of distance learning from the author’s point of view have been given.

Keywords: online education, video conferences, audio conferences, computer conferences, video lectures, chat sessions, and web sessions.

Дыстанцыйнае навучанне настолькі трывала ўвайшло ў наша паўсядзённае жыццё, што практычна немагчыма знайсці чалавека, які б не выкарыстоўваў яго ў той ці іншай меры. Рынак адукацыйных паслуг прапануе вялікую разнастайнасць відаў, форм і варыянтаў дыстанцыйнага навучання. Для забяспечання нава-

чальнага працэсу могуць быць задзейнічаны самыя розныя віды анлайн-адукацыі: відэаканферэнцыі; аудыёканференцыі; кампутарныя тэлеканферэнцыі; відэалекцыі; вэб-заняткі.

Для выкладання кожнай з дысцыплін могуць прымяняцца любыя віды анлайн-навучання, іх паспяховае спалучэнне дазваляе зрабіць працэс пазнання новага больш цікавым і прадуктыўным.

Відэаканферэнцыі забяспечваюць двухбаковую аўдыё- і відэасувязь паміж выкладчыкам і студэнтамі і даволі часта выкарыстоўваюцца ў праграмах дыстанцыйнага навучання.

Галоўнай перавагай такой формы віртуальных зносін з'яўляецца наяўнасць візуальнага кантакту ў рэжыме рэальнага часу. Гэта вялікі плюс, бо, бачачы студэнта, выкладчык можа кантраляваць ступень разумення прадмета, карэктаваць зацікаўленасць, задаючы пытанні і назіраючы за мовай жэстаў.

Да недахопаў гэтай формы можна аднесці яе адносную дарагоўлю. Відэаканферэнцыі апраўдваюць затраты на іх арганізацыю ў наступных выпадках: пры выкарыстанні на лекцыях і семінарах разнастайнага дэманстрацыйнага матэрыялу: прэзентацыі і др.; калі праводзяцца сустрэчы студэнтаў з навукоўцамі, практыкамі і г.д.; пры навучанні студэнтаў працы ў асяроддзі сучасных камунікацый пры арганізацыі дзелавога супрацоўніцтва [1].

Аўдыеканферэнцыі – гэта від электроннай канферэнцыі, падчас якой яе ўдзельнікі выкарыстоўваюць тэлефоны або абсталяванне, спецыяльна распрацаванае для галасавых зносін.

Аудыеканферэнцыі дастаткова даступны від навучання, дзякуючы адсутнасці складанасцяў у яе тэхнічным забеспячэнні.

Кампутарныя тэлеканферэнцыі – гэта відэаканферэнцыі, якія праводзяцца з выкарыстаннем ПК, падлучаных да высакахуткаснага Інтэрнэту і, якія абсталяваны мікрафонамі і лічбавымі відэакамерамі.

Вялікай перавагай кампутарных канферэнцый з'яўляецца тое, што людзі ўсяго свету могуць у іх удзельнічаць.

Асноўныя недахопы гэтага віду дыстанцыйнага навучання – абавязковая наяўнасць добрай хуткасці інтэрнэт-злучэння, якое не заўсёды можа быць тэхнічна забяспечана ў некаторых рэгіёнах, і неабходнасць закупляць спецыяльнае абсталяванне. Асабліва эфектыўна выкарыстоўваецца патэнцыял гэтай формы пры

арганізацыі калектыўнай работы студэнтаў, а таксама ў тых выпадках, калі ў дыстанцыйным навучанні задзейнічаюцца метады ролевых гульняў і інтэлектуальных конкурсаў.

Відэалекцыі ўпэўнена становяцца неад’емным відам анлайн-навучання. Як правіла, на экране транслююць запіс выступлення лектара, які агучвае пісьмовы матэрыял выкладчыка.

Бясспрэчная перавага гэтай формы падачы навучальнага матэрыялу перад традыцыйнай афлайнавай «начыткай» складаецца ў тым, што студэнт можа самастойна рэгуляваць ход відэалекцыі, колькі заўгодна раз вяртацца да папярэдніх раздзелаў і складаных момантаў.

Недахопам прымянення відэалекцыі, асабліва ў запісе, і па прычыне адсутнасці зваротнай сувязі з выкладчыкам, з’яўляецца немагчымасць задаць пытанні, якія ўзнікаюць у студэнтаў у працэсе прагляду відэалекцый.

Вэб-заняткі - гэта дыстанцыйныя семінары, канферэнцыі і іншыя формы вучэбнай дзейнасці, якія праводзяцца з выкарыстаннем тэлекамунікацыйных сродкаў і іншых рэсурсаў Інтэрнэту. Звычайна для арганізацыі вэб-заняткаў прымяняюцца форумы.

Галоўнай перавагай такіх заняткаў з'яўляецца тое, што яны ўяўляюцца даступнымі ў любы час у сетцы Інтэрнэт. Гэта дае выкладчыку магчымасць актывізаваць працу студэнтаў не толькі падчас правядзення аўдыторных заняткаў, але і пры выкананні імі самастойнай работы.

Роля дыстанцыйных тэхналогій у павышэнні эфектыўнасці адукацыі безумоўна вялікая. І хоць пры дыстанцыйным навучанні навучэнец і выкладчык прасторава адлучаны адзін ад аднаго, яны, тым не менш, знаходзяцца ў пастаянным узаемадзеянні, арганізаваным з дапамогай адмысловых прыёмаў пабудовы навучальнага курсу, формаў кантролю, метадаў камунікацыі, заснаваных на выкарыстанні Інтэрнэт-тэхналогій.

## Спіс выкарыстаных крыніц

1. Головко, Е.А. Методика организации и проведения видеоконференции при обучении иностранному языку / Е.А. Головко // Иностранные языки в школе. – 2010. - № 10. – С. 54-59.